International
Accountability
Platform
for Belarus

**Платформа для Беларусі заклікае дзяржавы АБСЕ прыняць унутраныя меры для актыўнай падтрымкі прыцягнення да адказнасці за злачынствы ў Беларусі**

На пасяджэнні Камітэта па чалавечым вымярэнні АБСЕ, якое адбылося сёння ў Вене, Платформа (IAPB) заклікала яго членаў прыняць больш дзейсныя ўнутраныя меры для прыцягнення да адказнасці меркаваных вінаватых у злачынствах па міжнародным праве. Нягледзячы на пагаршэнне сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і яе ролю ва ўкраінскім канфлікце, ,было распачатае расследаванне ўсяго некалькіх выпадкаў, а магчымасці пацярпелых атрымаць доступ да правасуддзя працягваюць звужацца**.**

На пасяджэнні Камітэта АБСЕ па чалавечым вымярэнні Платформа прадставіла сваю апошнюю справаздачу аб праведзенай працы, што падрабязна апісвае яе нядаўнюю працу па падтрымцы органаў крымінальнага правасуддзя і міжнародных структур па правах чалавека.

> "Усё большая колькасць зваротаў пацярпелых ад шматлікіх рэпрэсій або канфлікту, якія паступаюць у органы ўлады еўрапейскіх краін, не забяспечваецца дастатковымі рэсурсамі для расследавання і судовага разбору", – кажа Кейт Віньесваран, кіраўнік Платформы. "Дакументаванне меркаваных міжнародных злачынстваў, здзейсненых у Беларусі, мае вырашальнае значэнне для забеспячэння будучага судовага пераследу, але гэта мэта можа быць рэалізавана толькі ў тым выпадку, калі дзяржавы выдзеляць рэсурсы для яе ажыццяўлення".

У перыяд з красавіка па верасень 2023 года Платформа накіравала падрабязныя матэрыялы ў органы крымінальнага правасуддзя яшчэ дзвюх дзяржаў, у выніку чаго колькасць еўрапейскіх дзяржаў, якія атрымалі садзейнічанне Платформы ў правядзенні патэнцыйных расследаванняў меркаваных міжнародных злачынстваў, здзейсненых у Беларусі, павялічылася да трох. У матэрыялах змяшчаецца фактычны і юрыдычны аналіз асноўных фактаў і кантэкстуальных элементаў злачынстваў супраць чалавечнасці ў Беларусі, а таксама ролі дзяржаўных сілавых структур, якія маюць дачыненне да іх здзяйснення.

Платформа таксама падтрымала працу Упраўлення Вярхоўнага камісара па правах чалавека па вывучэнні сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і дакладчыка Маскоўскага механізму прафесара Эрве Аскенсія, у тым ліку прадаставіўшы доступ да сведкаў і спраў у сваёй калекцыі, а таксама інфармацыю аб дзяржаўных сілавых структурах, злачынствах на сэксуальнай і гендэрнай глебе і патрэбах у прыцягненні да адказнасці.

Падтрымка Платформай дакладчыка Маскоўскага механізма АБСЕ паспрыяла яго высновe аб здзяйсненні дзяржаўнымі суб'ектамі цэлага шэрагу парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі і паслужыла падставай для яго звароту да міжнароднай супольнасці з заклікам прыкласці больш намаганняў для прыцягнення вінаватых да адказнасці і працягваць падтрымліваць пацярпелых, грамадзянскую супольнасць і іншых суб'ектаў, што ўдзельнічаюць у забеспячэнні прыцягнення да адказнасці.

> "Згодна з нашым апошнім апытаннем, пацярпелыя і іншыя сведкі знаходзяцца больш чым у 30 краінах. Дакладчык Маскоўскага механізма АБСЕ, а таксама Вярхоўны камісар ААН рэкамендавалі дзяржавам дабівацца прыцягнення да адказнасці праз правядзенне нацыянальных працэсаў на аснове прынятых прынцыпаў экстэрытарыяльнай і ўніверсальнай юрысдыкцыі", - сказала Вікторыя Фёдарава, прадстаўнік Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі, які з'яўляецца адным з сузаснавальнікаў Платформы. "Мы заклікаем дзяржавы праявіць палітычную волю, вылучыць дадатковыя рэсурсы следчым органам, а таксама ініцыяваць змены ў сваім заканадаўстве".

Гэтыя запыты аб садзейнічанні былі задаволеныя ва ўмовах пагаршэння сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. На сённяшні дзень у турмах застаецца 1475 палітычных зняволеных. Цягам справаздачнага перыяду пры невядомых абставінах у зняволенні загінулі палітвязні беларускі блогер Мікалай Клімовіч і беларускі мастак Алесь Пушкін. Вядомыя апазіцыйныя палітыкі, у тым ліку Марыя Калеснікава, Мікола Статкевіч, Сяргей Ціханоўскі і Віктар Бабарыка працяглы час утрымліваюцца пад вартай без сувязі са знешнім светам. КДБ і МУС прызналі 148 арганізацый экстрэмісцкімі фармаваннямі, у тым ліку аднаго з сузаснавальнікаў Платформы -- Праваабарончы цэнтр "Вясна".

> “Мы пераадольваем супраціўленне беларускіх уладаў і працягваем сваю дзейнасць па зборы, апрацоўцы і сістэматызацыі доказаў меркаваных злачынстваў супраць чалавечнасці. Гэта адбываецца ў абстаноўцы паўсюдных рэпрэсій у дачыненні да пацярпелых і ціску на нас, праваабаронцаў,” сказаў Павел Сапелка, прадстаўнік Праваабарончага цэнтру “Вясна”, аднаго з сузаснавальнікаў Платформы. “Нашы агульныя намаганні па спыненні беспакаранасці павінны прынесці плён, калі ёсць палітычная воля дэмакратычных дзяржаў правесці расследаванне і прыцягнуць вінаватых да адказнасці. Кола меркаваных злачынстваў рэжыму пашыраецца і гэта патрабуе адэкватнага адказу.”

Платформа атрымала фінансаванне для працягу сваёй працы на наступныя тры гады, з кастрычніка 2023 г. па верасень 2026 г., на працягу якіх яна зможа выкарыстаць ужо створаную інфраструктуру і напрацаваны досвед для прымянення праактыўнага падыходу да забеспячэння прыцягнення да адказнасці і ўмацавання свайго падыходу, арыентаванага на пацярпелых.

**Пра Міжнародную платформу па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі**

Міжнародная платформа па прыцягненні вінаватых да адказнасці для Беларусі (International Accountability Platform for Belarus, IAPB) – гэта інавацыйная платформа грамадзянскай супольнасці, якая займаецца зборам, апрацоўкай, верыфікацыяй і захаваннем доказаў сур’ёзных парушэнняў правоў чалавека, якія з’яўляюцца злачынствамі па міжнародным праве, меркавана здзейсненых у Беларусі ў кантэксце прэзідэнцкіх выбараў 2020 года і ў наступны перыяд, з мэтай падтрымкі органаў па прыцягненні да адказнасці і забеспячэння доступу беларусаў і іншых пацярпелых да сродкаў прававвой абароны і кампенсацыі шкоды. З красавіка 2021 г. Платформа збірае інфармацыю і доказы катаванняў, згвалтаванняў і іншых актаў сэксуальнага і гендарнага гвалту, адвольных арыштаў і затрыманняў, пазасудовых забойстваў і іншых бесчалавечных дзеянняў, здзейсненых дзяржаўнымі суб’ектамі ў Беларусі, якія могуць

уяўляць сабой злачынствы супраць чалавечнасці. Платформа збірае інфармацыю і сведчанні ў пацярпелых і сведак як у Беларусі, так і за яе межамі, падаючы ім доступ да інфармацыі і магчымасць звярнуцца па псіхасацыяльную дапамогу незалежна ад іх месцазнаходжання. Кіруюць Платформай DIGNITY — Дацкі інстытут супраць катаванняў, Праваабарончы цэнтр “Вясна”, Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі і REDRESS.

Мандат Платформы падтрымліваецца Еўрапейскім Саюзам і дзяржавамі, у тым ліку Аўстрыяй, Вялікабрытаніяй, Германіяй, Даніяй, ЗША, Ірландыяй, Ісландыяй, Нарвегіяй, Нідэрландамі, Славакіяй, Фінляндыяй, Чэхіяй, Швейцарыяй, і Швецыяй. З улікам важнасці працы Платформы, яе мандат, пачатак якога прыпадае на 24 сакавіка 2021 г., быў падоўжаны ў 2022 г. да верасня 2023 г., а таксама зусім нядаўна – да верасня 2026 г.

У знак прызнання ўнёску ў прасоўванне правоў чалавека ў Беларусі “Вясна” ў верасні 2022 г. атрымала прэмію Альбі Фонду Клуні за справядлівасць, а яе заснавальнік Алесь Бяляцкі — Нобелеўскую прэмію міру у кастрычніку 2022 г. У студзені 2023 г. Міжнародны камітэт быў ушанаваны ўзнагародай “Праваабарончая кампанія / ініцыятыва года 2022”.